АКТЫЎныя дзеянні

Падтрымаць ініцыятыву? Без праблем!

Летась пярвічная арганізацыя БРСМ Беларускага металургічнага завода стала лепшай «пярвічкай» у краіне. Карэспандэнты «Чырвонкі» наведаліся ў Жлобін і пацікавіліся, як і за што даюць гэтае званне і чым звычайна заняты члены БРСМ з вышэйзгаданага прадпрыемства.

— У нас некалькі асноўных напрамкаў дзейнасці: спорт, культурна-масавая работа, навукова-тэхнічная творчасць, моладзевае супрацоўніцтва, а таксама абарона інтарэсаў маладых людзей, — распавядае **сакратар пярвічнай арганізацыі з правамі камітэта раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «БРСМ» Беларускага металургічнага завода Вячаслаў ЛІПАТКІН.**

Па яго словах, паколькі на Беларускім металургічным заводзе працуе каля 1600 членаў БРСМ (самая буйная пярвічная арганізацыя беларускіх прадпрыемстваў), нехта абавязкова павінен абараняць іх правы і ў калектыўным дагаворы, і на прадпрыемстве.

Напрыклад, раз на два-тры гады праходзіць адкрытае прыняцце калектыўнага дагавора, і прадстаўнікі «пярвічкі» стараюцца прасоўваць тыя ці іншыя прапановы, якія датычацца інтарэсаў маладых супрацоўнікаў. Дзякуючы гэтаму цяпер маладыя бацькі маюць адзін законны вольны дзень для таго, каб забраць жонку з радзільні (на заводзе некалькі відаў працоўных графікаў, выбівацца з іх вельмі складана.).

Па расказах Вячаслава Ліпаткіна, як толькі малады супрацоўнік прыходзіць працаваць, ён асабіста з ім сустракаецца, распавядае пра ўсе мерапрыемствы і адначасова цікавіцца інтарэсамі чалавека.

Камусьці, напрыклад, бліжэй спорт. Штогод «пярвічка» БМЗ арганізуе мерапрыемства пад назвай «Абаронца Айчыны», у якім бяруць удзел 150-200 чалавек: спаборнічаюць у адцісканні, падцягванні, дартсе, армрэслінгу, перацягванні каната, мініфутболе. Пераможцаў чакаюць прызы. Таксама многіх прывабліваюць турыстычныя злёты, дзякуючы якім аб'ядноўваецца ўся моладзь холдынга (у холдынг «Беларуская металургічная кампанія» ўваходзяць прадпрыемствы з Магілёва, Рэчыцы, Мінска і іншых гарадоў). Што датычыць тэхнічнай творчасці, то штогод моладзь прадпрыемства не пакідае без увагі міжнародную навукова-тэхнічную канферэнцыю, куды прыязджаюць удзельнікі як з Беларусі, так і з замежжа. Шмат хто праяўляе сябе ў гэтай сферы вельмі актыўна, кожнага і не прыгадаеш. Але, напрыклад, інжынер-канструктар Мікіта Самсонаў быў узнагароджаны дыпломам першай катэгорыі на XVIII Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ. Таксама Мікіта мае дыпломы за ўдзел у міжнародных навукова-тэхнічных і навукова-практычных канферэнцыях і публікацыі ў зборніках навуковых работ.

Яшчэ сярод моладзі БМЗ у пашане клуб інтэлектуальных гульняў, які існуе пяты год. Дарэчы, усе моладзевыя мерапрыемствы завод падтрымлівае фінансава, выдзяляе моладзі транспарт, калі ў гэтым узнікае патрэба.

Сярод маладых супрацоўнікаў Беларускага металургічнага завода ёсць людзі, якія не былі членамі БРСМ да таго, як трапілі на прадпрыемства. Большасць неўзабаве да арганізацыі далучаецца. Як лічыць Вячаслаў Ліпаткін, галоўная матывацыя для ўступлення ў БРСМ — магчымасць удзельнічаць у шматлікіх мерапрыемствах, якія праводзіць актыў «пярвічкі» на заводзе, ды і свае прапановы можна ўносіць. Так, на металургічным заводзе ёсць свая каманда КВЗ, створаная па прапанове супрацоўнікаў, называецца яна «Усе У Сталі». А яшчэ на заводзе працуюць два хлопцы, якія іграюць у рок-гурце. Гэта Юрый Казлоў і Сяргей Чарнавусаў.

Яны ўжо не раз выступалі перад публікай, у тым ліку і на рэгіянальных рок-фэстах. На думку Вячаслава Ліпаткіна, падтрымаць ініцыятыву не цяжка, самае складанае — вызначыць, чаго моладзь сапраўды хоча і што ёй цікава.

Віншаванне ветэранаў падчас акцыі памяці.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» Беларускага металургічнага завода.

Адкрытыя сэрцы

Марыя ВОІНАВА:

«ВАЛАНЦЁРСТВА — НЕ ТАЯ РЭЧ, НА ЯКОЙ МОЖНА «ПІЯРЫЦЦА»

Знайсці час для гутаркі з Марыяй Воінавай удалося паміж выступленнямі тэатра валанцёрскага атрада. Дзяўчына кіруе і самім атрадам, і яго трупай, а нядаўна стала пераможцай у рэспубліканскім конкурсе БРСМ «Валанцёр года — «Добрае Сэрца» ў намінацыі «Асабісты ўклад». Прыклад 19-гадовай другакурсніцы перакладчыцкага факультэта Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта пераконвае, што для добрых спраў зусім не трэба валодаць супермагчымасцямі. Галоўнае — проста быць захопленым сваёй справай.

— Як лёс прывёў у лінгвістычны ўніверсітэт?

— Я вучылася ў гімназіі з лінгвістычным ухілам, удзельнічала ў навукова-практычных канферэнцыях, неаднойчы займала першыя месцы на рэспубліканскіх этапах, стала лаўрэатам спецфонду Прэзідэнта. У мяне мама выкладае англійскую мову, калісьці і бабуля выкладала ў МДЛУ. Усё ў жыцці звязана з мовамі. Ва ўніверсітэце я пазнаёмілася з цудоўнымі людзьмі і стала валанцёрам. Мяне зацікавіла дзейнасць валанцёрскага атрада пярвічнай арганізацыі БРСМ універсітэта «Мы — дзецям». Я вельмі люблю дзяцей, яны шчырыя і адкрытыя, з імі лёгка кантактаваць. Вырашыла паспрабаваць, таму што проста вучыцца мне сумна, патрэбен пастаянны рух.

— Але знайсці яго можна ў розных сферах. Чаму вы выбралі менавіта дапамогу дзецям?

— Калі я была зусім маленькай, шмат часу праводзіла ў бабулі. Побач з яе домам быў інтэрнат. Я кантактавала з дзецьмі, у якіх па розных прычынах не было бацькоў, і з таго часу заўжды думала пра тое, што, калі вырасту, буду дапамагаць такім хлопчыкам і дзяўчаткам. Таму ва ўніверсітэце, калі мне прапанавалі стаць кіраўніком валанцёрскага атрада, адразу пагадзілася, бо адчула, што гэта маё.

— Ці лёгка кіраваць атрадам?

— У ім каля 100 чалавек, але пастаянна ва ўсіх мерапрыемствах удзельнічаюць 15 акцёраў і яшчэ 20 валанцёраў. Я б не сказала, што мне з імі складана. Зразумела, я заўжды перажываю, калі чалавек «валанцёрыць» першы раз, стараюся сама суправаджаць навічкоў. У дзіцячую анкалагічную бальніцу ў Бараўлянах не кожны зможа ездзіць, бо гэта псіхалагічна цяжка. Ёсць такія, хто пасля першай паездкі адмаўляецца. У дзіцячы дом — калі ласка, у анкацэнтр — не.

— Чым даводзіцца займацца падчас валанцёрства?

— Мы амаль штодня бываем у дзіцячай анкалогіі. Ёсць дзяўчаты, якія праводзяць заняткі па англійскай, рускай і іншых мовах. Маленькія пацыенты ляжаць там доўгі час і шмат прапускаюць са школьнай праграмы, а мы дапамагаем яе навярстаць. Неяк наведвалі васьмімесячную дзяўчынку, у якой не было бацькоў — нашы валанцёры дзяжурылі каля яе амаль кругласутачна. Даводзілася і карміць яе, і падгузкі мяняць, і гуляць.

Мы займаемся валанцёрствам не для таго, каб камусьці штосьці паказаць. Проста мы самі атрымліваем асалоду ад таго, што знайшлі сябе ў гэтай справе.

— Як жа вы спраўляецеся з гэтым без вопыту і спецыяльных ведаў?

— Перад тым, як адправіць кудысьці валанцёра, я з ім размаўляю. Калі трэба ехаць да маленькага дзіцяці, я пытаюся, ці ўмее чалавек абыходзіцца з немаўлятамі, калі не, дык ці не баіцца ён гэтага. Аднойчы не было каго адправіць, і вольны час быў толькі ў адной дзяўчыны. Але яна стала адмаўляцца і казаць, што ніколі не трымала немаўлятка на руках. Сітуацыя была крытычная, таму яна ўсё ж пагадзілася. І пасля гэтага сама пачала выказваць жаданне паехаць да малечы.

А некаторыя нашы валанцёры вучацца на выкладчыкаў замежных моў і на старэйшых курсах ужо ведаюць дзіцячую псіхалогію. Але я думаю, галоўнае ў стасунках з дзецьмі — усміхацца і не баяцца ісці на кантакт.

— Вы дапамагаеце толькі дзецям?

— Калі нам прапануюць з'ездзіць, напрыклад, у псіханеўралагічны дом-інтэрнат у Тарасіках, дзе знаходзяцца дарослыя людзі, мы не адмаўляемся. Але тут ужо свае асаблівасці і нюансы. Такія людзі, у адрозненне ад дзяцей, не заўжды гатовыя ісці на кантакт. І хоць дапамога патрэбна ўсім, але мне здаецца, што маленькім асабліва важна пакінуць хоць крыху шчаслівых успамінаў.

— З якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца ў рабоце валанцёра?

— Цяжкасці бываюць хіба што ў перыяд падрыхтоўкі пастановак. Мы самі займаемся касцюмамі, рэквізітам, дэкарацыямі, купляем падарункі. А што датычыць стасункаў… Аднойчы я пасябравала ў анкацэнтры з хлопцам, на той момант яму было 18 гадоў. Наведвала амаль штотыдзень. Але вылечыць яго не змаглі: ён памёр. Пасля гэтага было цяжка…

Аднойчы нам сказалі: маўляў, у вас у жыцці ўсё выдатна, дык вырашылі ў добранькіх пагуляць? Дзеці не вераць, што камусьці могуць быць патрэбнымі.

— Вы кіруеце дзіцячым тэатрам «Разам у казку», які існуе на базе атрада. Як узнікла ідэя яго стварэння?

— Адна справа проста прыязджаць да дзяцей, размаўляць і гуляць з імі, і зусім іншая — прывозіць спектакль, у якім яны самі могуць паўдзельнічаць. Я хоць і не заўважала за сабой асаблівага акцёрскага таленту, але заўжды пісала сцэнары для розных мерапрыемстваў. Прага творчасці была, таму вырашыла паспрабаваць стварыць сваю трупу. Наколькі я ведаю, такога тэатра няма ні ў адным універсітэце.

— Як звычайна вас успрымаюць дзеці?

— Калі мы ездзілі ў ждановіцкі дзіцячы дом да дашкалят, тыя літаральна з парога пачыналі знаёміцца і ўжо праз пару візітаў ведалі нас усіх па імёнах, гулялі з намі, рабілі макіяж і прычоскі, быццам бы знаёмыя з намі шмат гадоў *(усміхаецца)*. А калі супрацоўнічалі з дзіцячым домам № 5, дзе большасці гадаванцаў ад 10-ці да 16-ці гадоў, да нас спачатку ставіліся з недаверам. Аднойчы нам нават сказалі: маўляў, у вас у жыцці ўсё выдатна, дык вырашылі ў добранькіх пагуляць? Дзеці не вераць, што камусьці могуць быць патрэбнымі.

У Бараўлянах усё яшчэ больш цяжка. Той жа хлопец, да якога я ездзіла, спачатку казаў мне: «Навошта ты сюды цягаешся? Я не інвалід!» Але з часам добрае стаўленне, якога не хапае гэтым дзецям, дапамагае нам пасябраваць.

— Што падштурхнула да ўдзелу ў конкурсе «Валанцёр года»?

— Мне прапанавалі зрабіць прэзентацыю дзейнасці атрада і паўдзельнічаць у намінацыі «Асабісты ўклад». Напэўна, журы ацаніла мой «асабісты ўклад» таму, што ніводнае мерапрыемства атрада не праходзіць без майго ўдзелу.

Увогуле я хацела адмовіцца ад конкурсу, таму што на гэта амаль не было часу. Але ўсё ж зрабіла прэзентацыю з відэаролікам і забылася пра яе. Праз нейкі час мне паведамілі, што я перамагла. Было, вядома, прыемна…

— І як гэта — адчуваць сябе лепшым валанцёрам года?

— Для мяне гэтае званне нічога не змяніла. Я буду працягваць рабіць тое, што і раней. Я ўвогуле не вельмі люблю, калі ўсе навокал кажуць, якія мы малайцы, бо валанцёрства — не тая справа, на якой можна «піярыцца». Мы займаемся ім не для таго, каб камусьці штосьці даказаць ці паказаць. Проста мы самі атрымліваем асалоду ад таго, што знайшлі сябе ў гэтай справе. З іншага боку, я радуюся перамозе, бо яна прыцягнула ўвагу да нашай дзейнасці. Нам цяпер дапамагаюць закупляць падарункі для дзяцей, з'явілася шмат запрашэнняў выступіць у розных установах… Увогуле, я не ўяўляю сябе без валанцёрства, і нават пасля заканчэння ўніверсітэта мне не хацелася б пакідаць атрад.

— А як ставяцца да валанцёрства вашы родныя?

— Спачатку бацькі перажывалі, што гэта пашкодзіць вучобе. Але неўзабаве яны ўбачылі вынікі. У нас у атрадзе была дзяўчына, якая ездзіла ў дзіцячы дом, а пасля яны з бацькамі ўзялі адтуль дзіця. І такі выпадак не адзіны. Калі я распавядаю ім пра гэта, яны бачаць, што ўсё, што мы робім, недарэмна. Я думаю, яны мной ганарацца.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.